УДК 394.2:[398+7.046]

***А. М. Аляхновіч,***
*кандыдат філалагічных навук, прафесар,*
*прафесар кафедры рэжысуры ўстановы адукацыі*
*«Беларускі дзяржаўны ўніверсітэт культуры і мастацтваў»,*
*г. Мінск, Беларусь*

# МАСТАЦКІ ВОБРАЗ НАРОДНАГА СВЯТА

**Анатацыя.** Аналізуюцца розныя аспекты фарміравання і раскрыцця мастацкага вобраза свята. Асаблівая ўвага звяртаецца на ўзнаўленне міфалагічнай асновы і актывізацыю гледачоў. Падкрэсліваецца важнасць выкарыстання іншасказальных сродкаў у структуры мастацкага вобраза. Паказана, што яны ўзбагачаюць мастацкую палітру святочных дзей яскравымі фарбамі, раскрываюць іх сімвалічнае значэнне ў кірунку ігры, забавы. Пры гэтым трэба заўсёды ўвасабляць другі, схаваны язычніцкі аспект. Менавіта ён раскрывае светаразуменне старажытнага чалавека. Слушна сцвярджаецца, што мастацкі вобраз – асноватворная катэгорыя, ядро, нават першаэлемент народнага свята.

**Ключавыя словы**: канцэпцыя, народнае свята, абрад, глядач, сімвал, алегорыя, метафара, міфалагічны персанаж, язычніцтва.

***A. Alyakhnovich,***
*PhD in Philology, professor, professor of the Directing department of the Educational Institution "Belarusian State University of Culture and Arts",*
*Minsk, Belarus*

# ARTISTIC IMAGE OF THE NATIONAL HOLIDAY

**Abstract.** The article analyzes various aspects of the formation and disclosure of the artistic image of the holiday. Particular attention is paid to the reproduction of the mythological basis and the activation of the audience. The author emphasizes the importance of using non-verbal means in the structure of the artistic image, shows that they enrich the artistic palette of festive events with bright colors, reveal their symbolic meaning in a playful, entertaining direction. At the same time, it is always necessary to embody the second, hidden pagan aspect. It is this reveals the worldview of ancient man. It is rightly asserted that the artistic image is the main category, the core, even the primary element of the national holiday.

**Kewords:** concept, folk holiday, rite, spectator, symbol, allegory, metaphor, mythological character, paganism.

Паняцце «вобраз» у мастацтве раскрываецца як своеасаблівая форма адлюстравання рэчаіснасці мастаком у падрыхтаваным ім творы мастацкімі сродкамі (пластычнымі, слоўнымі, мімічнымі, гукавымі) і ўзнаўляецца ў свядомасці гледача, чытача, слухача, якія яго ўспрымаюць.

Адрозніваюць індывідуальныя, абагульненыя, зборныя, скразныя мастацкія вобразы, якія ўвогуле – з'ява складаная, яна аб'ядноўвае самыя розныя мастацкія кампаненты: ідэю, сэнс, стыль, жанр, змест, адзіную форму.

Мастацкі вобраз шчыльна звязаны з творчымі здольнасцямі і назіральнасцю, духоўнымі якасцямі асобы. Ён фарміруецца з дапамогай думак і выступае як працэс, яму ўласцівы пэўныя незавершанасць, неадназначнасць, быццам прызначаныя на роздум таго, хто яго ўспрымае.

Мастацкі вобраз народнага свята трактуецца як рэжысёрская задума, адлюстраваная ў слоўным, музычным, дэкаратыўнаархітэктурным і пластычным вырашэннях. Адразу заўважым, што гэта вызначэнне не ўключае яшчэ адзін складальнік мастацкага вобраза, а менавіта гледачоў, якія не павінны з'яўляцца спажыўцамі, назіральнікамі мастацтва, а прымаюць актыўны ўдзел у выкананні святочных дзей. Трэба яшчэ дадаць, што ўспрыманне мастацкага вобраза адбываецца аднойчы «тут і зараз» і ніколі не паўтараецца.

Ідэя народнага свята заключаецца ў тым, каб раскрыць і ўвасобіць сутнасць міфалагічнага мыслення чалавека мінулага з улікам эвалюцыі святочнай традыцыі, яе трансфармацыі ў ігравыя формы.

Святы каляндарнага цыкла складаюць аснову культуры ў самым шырокім значэнні гэтага слова. У іх увасобіліся этнічныя асаблівасці і гісторыя народа. Фарміраванне і ўзнаўленне мастацкага вобраза ў сувязі з гэтым набывае актуальнае значэнне.

У навуцы, на жаль, адсутнічае агульная канцэпцыя стварэння мастацкага вобраза менавіта народнага свята, кожны з аўтараў разглядае толькі асобныя пытанні, якія маюць лакальнае значэнне. Так, пры яго распрацоўцы амаль не закранаецца рэжысёрскае бачанне ў раскрыцці міфалагічнага светапогляду старажытнага чалавека. Гэта прынцыпова важна, каб рэжысёр добра ведаў, што аўтарам свята з'яўляецца народ, што чалавек мінулага не ўмеў мысліць абстрактна, надзяляў свядомасцю

прадметы і аб’екты рэчаіснасці, абагаўляў прыроду, прасіў у яе міласці для сябе і сваёй сям’і. У сувязі з тым, што не мог растлумачыць многія катаклізмы (пажары, паводкі, землятрусы), якія прыносілі чалавеку няшчасці, нарадзіў у сваёй свядомасці разнастайных багоў, вобразаў, персанажаў, якім пакланяўся, выконваў разнастайныя абрадавыя дзеі, танцы, варожбы, песні, выявы, ладзіў вогнішчы, ігрышчы, шэсці і інш.

Так узніклі святы, што дайшлі да нашага часу ў пераасэнсаваным выглядзе. Трансфармацыя святочнай практычнай утылітарнай функцыі адбывалася ў ігравым, пацяшальным кірунку, але разам з ёю заўсёды захоўваецца першасная, язычніцкая.

У сучасных святах некаторыя рэжысёры ўвасабляюць толькі забаўляльную функцыю, ператвараюць яе ў гульню, забываюць пра другі схаваны падтэкст. Па сутнасці, нельга назваць святам тое, дзе не знаходзіць адлюстравання яго язычніцкая аснова. Па вялікаму рахунку менавіта яна прадстаўляе рэжысёру магчымасці для ўвасаблення шырокага кола фантазій, выкліканых міфалагічнымі асацыяцыямі.

Менавіта ў іх заўважаецца сімвалічнасць вобразаў і рытуальных дзей (пераапрананні, варожбы, прыгатаванне абрадавых страў), раскрываецца мастацкі вобраз свята.

У кожным народным свяце можна знайсці мноства вобразаў. Напрыклад, зімовы цыкл свят уключае касмічныя аб’екты (сонца, месяц, зоркі), прадметы і рэчы хатняга ўжытку, розныя ўпрыгожванні, расліны, кветкі, рытуальныя стравы (хлеб, блін, куцця, каша). Усе яны ўспрымаюцца ў сімвалічным значэнні. Гэта выдатны набор зыходных даных для раскрыцця святочнай язычніцкай сімволікі.

Некаторыя элементы даўніх абрадаў каляндарнага цыкла дайшлі да нашага часу, напрыклад, спальванне на агні пудзіла Масленіцы, якая сімвалізуе зіму і смерць.

Вывучаючы сімвалічны сэнс народных свят, можна пераканацца, што кожнае свята адрозніваецца ад іншых сваім непаўторным вобразам, атмасферай, эстэтыкай і стылістыкай. Яго цветавы колер, настрой, рытм выканання рытуальных дзей у мінулым адпавядалі сімвалічнаму значэнню, каляндарнаму цыклу і часу ўзнаўлення свята. Як агульную асаблівасць святочнай культуры трэба адзначыць перавагу ў ёй прыродных і астранамічных з’яў – сонцастаянне, раўнадзенства, наступ-

ленне пэўнай пары года, даты правядзення свят і сельскагаспадарчых работ.

Пачатак і заканчэнне кожнай пары года адзначаліся рытуаламі сустрэч і провадаў – «пахавання» зімы, вясны, лета, восені. Рытуальныя дзеі суправаджаліся прыгатаваннем сімвала – хлеба, упрыгожваннем дрэва, паленнем вогнішча. Наладжваліся шэсці з выкананнем песень, карагодаў з удзелам моладзі і дзяцей. Провады як выгнанне (провады русалкі) суправаджаліся знішчэннем сімвалаў – іх палілі, тапілі, хавалі, разрывалі.

Цікава, што святочная сімволіка ніколі не належыць якой-небудзь адной пары года, яна заўсёды пранізвае іх, гэта значыць праходзіць па ўсіх часавых і прасторавых перыядах культуры з мінулага ў будучае. Сімвалы (напрыклад, крыж, кола) валодаюць вялікай вобразнасцю, а таксама эмацыянальна-пачуццёвым уздзеяннем на чалавека, яго духоўны свет.

Народнае светаўспрыманне і фантазія быццам вылучылі ў якасці мастацкага вобраза міфалагічны персанаж (Каляда, Ляля, Цёця, Купала), які аб’ядноўвае ўвесь комплекс відовішчна-гульнявой культуры беларусаў.

У рэжысуры стварэння мастацкага вобраза свята можна заўважыць наступную логіку яго пабудовы: спачатку рэжысёр знаходзіць абагульнены вобраз, у якім знайшла ўвасабленне ідэя. Затым гэты вобраз раскладваецца на прыватныя сэнсавыя фрагменты (эпізоды, нумары), у якіх асобныя выразы спалучаюцца адно з другім і ўтвараюць абагульнены вобраз – сімвал усяго свята. Так, на наш погляд, можна пабудаваць абагульнены вобраз свята «Беларусь – любоў мая» ў трох іпастасях: «Беларусь – мірная», «Беларусь – ваенная», «Беларусь – малая радзіма».

Галоўны недахоп сучаснага свята, у тым ліку народнага, у дакладным падзеле на выканаўцаў і гледачоў. Апошнія выступаюць як пасіўныя спажыўцы мастацтва, якія толькі назіраюць за ходам святочных дзей. У гэтым выпадку свята губляе сваю прыкмету – адсутнасць падзелу на гледачоў і выканаўцаў, становіцца адчужаным ад большасці людзей, успрымаецца як штосці незнаёмае.

Для таго, каб пазбегнуць адзначаных негатыўных недарэчнасцей, неабходна ў рэжысёрскай і сцэнарнай распрацоўцы прадугледзець шляхі актывізацыі гледачоў, распрацаваць свое-

асаблівую «партытуру» іх паводзін і ўдзелу ў сцэнічных дзеях. Неабходна, на наш погляд, унесці ў развіццё сюжэта элементы творчай гульні, якая ўласціва людзям усіх узростаў.

Для пераадолення перашкод паміж выканаўцамі і гледачамі можна выкарыстоўваць разнастайныя прыёмы актывізацыі: сумеснае выкананне песень, карагодаў; эмацыянальнае ўздзеянне на гледачоў (гульня, музыка, слова, свет, феерверк); прыцягненне да ўдзелу ў конкурсах, атракцыёнах; стымуляванне зацікаўленасці гледачоў сувенірамі, падарункамі, сюрпрызамі. Актывізуе гледачоў таксама ўдзел у спаборніцтвах, гульнявых конкурсах і тэатралізаваных схватках.

Пры гэтым важна ўсведамляць, што сістэма стымулюючых мерапрыемстваў гледачоў павінна быць пабудавана на аснове народных традыцый. Вызначым некаторыя з іх: выкарыстанне алегарычных, міфалагічных, казачных персанажаў для раскрыцця старажытнага светапогляду чалавека; касцюміраванне ўдзельнікаў у народныя персанажы, якое дапамагае ператварэнню чалавека ў выканаўцу рытуальнага дзеяння; наладжванне вядомых працоўных, творчых, гульнявых конкурсаў, выступленняў, якія часта носяць жартоўны характар; стварэнне ўмоў для сумеснай харавой і танцавальнай імправізацыі, якая спантанна жыве ў народзе і адлюстроўваецца ў фальклорных формах; далучэнне гледачоў да выканання абрадавых дзей у святах каляндарнага цыкла, такіх як зімовыя ігрышчы, правады зімы, сустрэча вясны, надыход лета, спасаўскія падарункі і інш.

Здаўна вядомы прыём актывізацыі гледачоў – заманьванне ў дзеянне пры дапамозе гульні сярод прысутных, якое пераходзіць у гульню з імі самімі. Таксама эфектыўны спосаб уцягвання гледачоў – хаджэнне музыкаў ад адной святочнай пляцоўкі да другой і наладжванне з прысутнымі спеваў, танцаў і гульняў.

Напрыканцы адзначым, што мастацкі вобраз народнага свята, як ні які іншы, павінен быць вырашаны з выкарыстаннем іншасказальных сродкаў. Яны найбольш адпавядаюць прыродзе міфалагічнага мыслення – мысліць вобразамі. Сімвалы, алегорыі, метафары, гіпербалы глядач не павінен заўважаць як прыём ці форму адлюстравання сцэнічнай дзеі, а менавіта з іх дапамогай эмацыянальна ўспрымаць развіццё сюжэта. Яны

нараджаюць асацыяцыі ў гледача, дапамагаюць паэтапнаму асэнсаванню дзеяння і стварэнню на яго аснове мастацкага выразу свята.

Такім чынам, прафесійныя кампетэнцыі рэжысёра ўключаюць не толькі рэалізацыю задумы свята, але і ўздзеянне на гледача, на яго ўнутраны свет. Таму быць выдатным рэжысёрам азначае ведаць актуальныя праблемы сучаснасці, валодаць уменнем мысліць незвычайна, улічваць псіхалогію людзей featureрознага ўзросту, іх этнічныя асаблівасці, ствараць у рэжысуры падтэкст у развіцці сюжэта, магчымасць дадумаць яго ў сувязі з пачутым і ўбачаным на сцэне. Вырашыць гэтыя задачы магчыма пры ўмове стварэння мастацкага вобраза, які скіраваны на развіццё мыслення гледача, надае святу прывабнасць і загадкавасць.

УДК [316.722+7.046.1](476)(48)

***Ю. С. Барадзін,***
*аспірант кафедры культуралогіі ўстановы адукацыі*
*«Беларускі дзяржаўны ўніверсітэт культуры і мастацтваў»,*
*г. Мінск, Беларусь*

## БЕЛАРУСКАЯ І СКАНДЫНАЎСКАЯ МІФАЛОГІЯ Ў МІЖКУЛЬТУРНАЙ КАМУНІКАЦЫІ

**Анатацыя.** Міжкультурная камунікацыя паміж Рэспублікай Беларусь і прадстаўнікамі скандынаўскіх краін неабходна як сродак узаемасувязі і зносін паміж людзьмі, якія прадстаўляюць свае культуры. Беларусы і скандынаўскія народы могуць паміж сабой абменьвацца ўласнымі міфалогіямі, пантэонам багоў, каб перадаваць інфармацыю ад адной язычніцкай культуры да другой, і ствараць такім чынам параўнальную міфалогію.

**Ключавыя словы:** міфалогія, язычніцтва, міжкультурныя сувязі, камунікацыі, масавая культура, сучаснасць, пантэон, багі.

***Y. Baradzin,***
*Postgraduate student of the Department of Cultural Studies of the*
*Educational Institution "Belarusian State University of Culture and Arts",*
*Minsk, Belarus*